

# НЯМЦЭВІЧЫ

## САПРАЎДНЫЯ ГІСТОРЫІ

1



Анатоль ГЛАДЫШЧУК

# НЯМЦЭВІЧЫ
## САПРАЎДНЫЯ ГІСТОРЫІ

341863-67

ПРОВЕРКА ФОНДА
4 8 2013

МІНСК
«ЛИТЕРАТУРА И ИСКУССТВО»
2009



УДК 94(476)
ББК 63.3(4Беи)
Г52

Выданне ажыццёўлена па заказе і пры фінансавай падтрымцы
Брэсцкага абласнога выканаўчага камітэта

У кнізе выкарыстаны фотаздымкі і іншыя фотаматэрыялы,
прадстаўленыя аўтарам А. Гладышчуком

Аўтар выказвае шчырую падзяку за дапамогу ў падрыхтоўцы кнігі загадчыку
кафедры беларускай мовы Брэсцкага дзяржаўнага універсітэта імя А. С. Пушкіна
кандыдату філалагічных навук, дацэнту Новік Марыі Іванаўне

ISBN 978-985-6720-55-3

© Гладышчук А. А., 2009
© Афармленне. РВУ «Литература и Искусство», 2009

## Да чытача

*Асабістае знаёмства з Урсын Нямцэвічамі, якія прыехалі ў Брэст з Францыі, Канады і Польшчы, адбылося ў холе Брэсцкай абласной бібліятэкі 17 мая 2002 года. Нагодай для такога з'езда нашчадкаў Юльяна Урсын Нямцэвіча з'явілася канферэнцыя, прысвечаная нашаму знакамітаму земляку, які нарадзіўся ў Скоках каля Берасця 16 лютага 1758 года ў маёнтку свайго бацькі. Да гэтага асаблівай цікавасці да роду Урсын Нямцэвічаў за сабою не заўважаў і ведаў пра іх не больш, чым кожны з нас.*

*Было насамрэч цікава назіраць, як сталыя ўжо людзі, якія носяць такое знакамітае і вядомае ва ўсім свеце прозвішча, стрымана вітаюць адзін аднаго, таму што некаторыя з іх пазнаёміліся асабіста толькі на гэтай канферэнцыі. Такім быў час, у якім яны пражылі амаль усё сваё жыццё, які не дазваляў ім гучна заявіць пра сваю прыналежнасць да знакамітага роду. Лёс і выпрабаванні зрабілі іх вельмі стрыманымі.*

*Рэгламент канферэнцыі не дазваляў, на жаль, знайсці час для нейкіх асабістых кантактаў з Нямцэвічамі, але, калі Вітальд даведаўся, што я стала жыву ў Скоках і гісторыя іхняга роду з гэтага пункту погляду мяне цікавіць неяк больш, чым іншых, ён прапанаваў мне прысласць пасля апрацоўкі ўспаміны апошняга гаспадара скокаўскага палаца Станіслава Урсын Нямцэвіча, якія для ўсіх Нямцэвічаў прывезла з Францыі яго дачка Тэрэса, што нарадзілася ў Скоках. Верагодна, гэтая прапанова выявіла на маім твары сапраўды шчырую цікавасць да гісторыі роду Нямцэвічаў.*

*Праз месяц у Скокі прыйшла з Польшчы бандэроль з манускрыптам Станіслава Урсын Нямцэвіча «Маім унукам». Манускрыпт выпадкова адкрыўся на пятай старонцы, дзе я адразу ўбачыў разгадку прызначэння цаглянай калоны на Рахвале. Кола гістарычнай спадчыны Нямцэвічаў пачало круціцца — я зразумеў, што Нямцэвічы мяне ўжо не адпусцяць. На той час, калі Барбара Урсын Нямцэвіч, якая жыве ў Польшчы, для мяне з вялікай цяжкасцю знайшла ў букіністычнай лаўцы «Pamiętniki czasyw moich» Юльяна Урсын Нямцэвіча, выдадзеныя ў Польшчы ў 1957 годзе, я ўжо меў ксеракопію першага французскага выдання 1848 года. Мае сціплыя веды ў польскай мове і вельмі розны змест тэкстаў абодвух выданняў склалі для мяне нейкую асабістую цяжкавырашальную задачу — як карыстацца «Успамінамі часоў маіх» Юльяна Урсын Нямцэвіча? Тлумачэнні рэдактара другога польскага выдання і асабіста Вітальда Урсын Нямцэвіча далі магчымасць зразумець, што нічога асаблівага ў гэтым няма — Юльян не раз перапісваў свае «Успаміны часоў маіх» і кожны раз па-новаму, і яго рукапісы, якія знаходзяцца ў розных архівах, насамрэч адрозніваюцца зместам, таму так і здарылася, але пры другім выданні рэдактар на гэтую акалічнасць звярнуў увагу, таму там часта змешчаны спасылкі на французскае першае выданне.*

*У творчыя планы не ўваходзіла рабіць пераклад «Успамінаў...» з польскай мовы на беларускую, меркавалася толькі выкарыстанне іх для задуманых мною «Сапраўдных гісторый пра Нямцэвічаў». Але творчыя планы на тое і творчыя, каб ствараць нешта новае. Паглыбленне ў змест тэкстаў абодвух выданняў, якія ніколі не друкаваліся ў Беларусі, як, на жаль, і іншыя творы Юльяна Урсын Нямцэвіча, прымусіла шукаць нейкую сваю ўласную схему для аб'яднання тэкстаў двух выданняў, змест якіх паказаўся мне вельмі цікавым і якога не хацелася губляць. Вядомы фізічны закон Дальтона падказаў, як гэта магчыма*

*зрабіць. Закон сцвярджае, што ціск сумесі двух розных газаў, напрыклад, кіслароду і азоту, роўны простай суме парцыяльных ціскаў гэтых газаў (парцыяльны ціск — гэта такі ціск, які кожны газ стварае ў нейкім аднолькавым аб'ёме, калі знаходзіцца там асобна). Так фізічная ідэя легла ў аснову, па сутнасці, аб'яднання двух розных тэкстаў аднаго і таго ж аўтара, адных і тых жа «Успамінаў часоў маіх», але выдадзеных з часавым інтэрвалам амаль у сто гадоў. Тэксты паводле закону Дальтона растварыліся адзін у адным, менавіта растварыліся, а не былі дадаткам адзін да аднаго.*

*Так нечакана для мяне вырашылася праблема выкарыстання тэкстаў «Успамінаў часоў маіх», якія, па сутнасці, былі менавіта запазычаны мною ў Юльяна Урсын Нямцэвіча і склалі чатыры асобныя гісторыі — «Дзіцячыя летуценні Юльяна», «Век хлапчукоўскі», «Школа рыцараў» і «Ад'ютант князя», дзе па-новаму сфарміраваны тэкст аб'ядноўвае практычна змест абодвух выданняў «Успамінаў часоў маіх» і ахоплівае перыяд жыцця Юльяна ад нараджэння ў Скоках і да выйсця ў свет у якасці ад'ютанта князя Адама Чартарыйскага. Змест на самай справе настолькі цікавы і так цесна спалучаны з нашым мінулым, што нельга было дазволіць сабе нешта не выкарыстаць для названых вышэй гісторый. Безумоўна, гэтыя тэксты належаць пяру знакамітага нашага земляка, але ўпершыню перакладзены на беларускую мову, па-іншаму апрацаваны і складзены з абодвух выданняў «Успамінаў часоў маіх».*

*Увесь твор «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі» складаецца з дванаццаці гісторый, якія вельмі адрозніваюцца зместам, але аб'ядноўваюць разам 250 гадоў гісторыі знакамітага роду Урсын Нямцэвічаў каля Берасця. Яны адкрываюць розныя абставіны іх жыцця і падкрэсліваюць гістарычную спадчыну, якая сёння выклікае не толькі звычайную цікавасць, але і можа стаць дзяржаўнай каштоўнасцю. Заключае кнігу «Радавод Урсын Нямцэвічаў», які аб'ядноўвае ўсе вядомыя даследаванні роду Нямцэвічаў, дзе ўпершыню згадваецца, што Нямцэвічы ў Нэплі на Бугу прыйшлі з Лявошак ля Картуз-Бярозы (сёння г. Бяроза Брэсцкай вобласці).*

# Прадмова

Знакамітых родаў на Беларусі было шмат, нават вельмі шмат, але бясконцыя ціскі гістарычнага прэсу на наш край стваралі для многіх з іх трагічныя абставіны. Лёс і роля гэтага адметнага для нашай зямлі роду часцей выдае дэтэктыўнай, чым гістарычнай спадчынай, якой кожны з нас мае права ганарыцца. Не закранаючы палітычных абставін мінулых часоў, можна пагадзіцца, што ўсё, што мае дачыненне да нашай беларускай зямлі, да тых людзей, якія стагоддзямі тут жылі, нараджаліся і паміралі, – гэта і ёсць нашае мінулае, без якога не толькі нельга ўявіць будучыню, але, што яшчэ важней для сучаснікаў, — нельга ўсвядоміць і сённяшняе. Ці трэба мець шмат розуму, каб уцяміць, што гістарычная калода без тузоў, каралёў, дам і нават валетаў непрыдатная для будучай гульні?

Нямцэвічы — вядомы род на Беларусі, але знакамітасць сваю ён прыдбаў найбольш праз аднаго з іх — Юльяна Урсын Нямцэвіча, паэта і пісьменніка, палітычнага дзеяча і сакратара-ад’ютанта Тадэвуша Касцюшкі. Лёс Юльяна Урсын Нямцэвіча падобны да лёсу многіх нашых землякоў, якія ніколі не адмаўляліся ад сваіх каранёў і той зямлі, на якой яны нарадзіліся і якая іх узгадавала. Нарадзіўся і вырас ён у радавым маёнтку Скокі каля Берасця, аднак большую частку свайго сталага жыцця Ю. Нямцэвіч вымушаны быў правесці далёка ад родных мясцін. І сёння, нягледзячы на тое, што цікавасць да гістарычнай спадчыны імкліва расце, мы ўсё яшчэ ніяк не можам зрушыць з месца той велізарны гістарычны замшэлы валун, каб гучна і без агаворак вымавіць: «Гэта ён, наш Юльян Урсын Нямцэвіч!»

І нічога крыўднага няма, калі хтосьці з іншай краіны яго таксама назаве сваім. Месца ў гістарычнай спадчыне не патрабуе змены дзяржаўных меж, а, наадварот, можа стаць добрай падставай для паразумення і дабрачыннасці.

Калі нават павярхоўна паспрабаваць асэнсаваць нашу гістарычную спадчыну, то нельга не здзівіцца, які моцны след пакінулі нам тут продкі, падпарадкаваўшы свае нялёгкія ўчынкі невядомым нам і іхнім пажаданням Богу. Што ні крок — абавязкова ўбачыш нейкі глыбока законспіраваны гістарычны маячок. І, можа, адразу ён не засвеціць, а спатрэбіцца пэўны час і натхненне, каб раздзьмухаць гэтую застылую на гістарычным холадзе іскрынку мінулага, але як шмат задавальнення потым яна прынясе і таму, хто знайшоў яе, і таму, хто ўбачыць яе святло.

Мінулае — як цень, як нейкі цудоўны міраж, які ўжо ніколі не ўзнікне, а толькі адлюструецца імгненнем сённяшняй памяці, каб пацешыць будучыню. Час — як выпушчаная Богам страла, як безупынны цягнік, які імкнецца толькі ў будучыню, вокамгненна праносячы чалавечы лёс праз жыццё, якое неўзабаве апынаецца ў мінулым. Чалавек — як дзейная асоба, як натхнёны фантазёр, які стварае за час, адведзены яму Усявышнім, шмат чаго добрага, не мінаючы і дрэннае, і які неўзабаве знікае, імкліва аддаляючыся кропкай на небасхіле стагоддзяў, пакуль зусім не знікне. І маўклівымі сведкамі той былой дзейнасці дзе-нідзе праступяць разбураныя падмуркі, раскіданыя валуны і, у лепшым выпадку, дрэвы, якія ён пасадзіў пры жыцці і якія маюць век у некалькі разоў большы за чалавечы. Гэта нечаканы цуд, калі нашчадкам застаецца нешта большае — пабудаваны храм альбо палац, якія выпрабоўваюць дзеючую генерацыю на магчымасць яе будучыні. Так было, так ёсць і так будзе. У гэтым не толькі высокі сэнс гістарычнай спадчыны, але і магчымасць захаваную спадчыну ўзбагачаць, памнажаць і перадаваць нашчадкам.

# Урсын Нямцэвічы

Сувязі роду Урсын Нямцэвічаў з сённяшнімі беларускімі землямі бяруць пачатак са старажытных часоў. Адно з паданняў, пра якое ўзгадвае Юльян Урсын Нямцэвіч, апавядае, што пратапласт гэтага роду заснаваў Юльян Урсын, які ў складзе рымскай дружыны пад кіраўніцтвам Палемона[1] высадзіўся на ўзбярэжжы Балтыкі з мэтай заснаваць Літоўскае княства. Гэтая падзея, згодна са старажытнымі хронікамі, магла адбыцца ў I альбо IV стагоддзях нашай эры. Праўда, легенда пра Палемона досыць спрэчная і выклікае ў гісторыкаў сумненне, ці існавала яна ўвогуле. Як адзначае вядомы гісторык з Беластока Алег Латышонак у сваёй працы «Палемон. Коды легенды», арыгінала даўніх тэкстаў хронік не захавалася, а ў больш позніх тэкстах «відаць выразныя сляды пазнейшай перапрацоўкі». Ад польскага гісторыка Яна Длугаша даведваемся, што «...нейкі рымскі князь Палемон, Неронаў сваяк, на чале пяцісот чалавек рымскай шляхты сеў на караблі і ўцёк з Рыма, кіруючыся на Захад. Са згаданай шляхты найбольш выдатнымі былі чатыры роды Кітаўрасы, Калюмны, Ружы і Угры (Урсіны)». А. Латышонак лічыць, што версія пра Палемона надуманая, але не будзем удавацца ў гістарычную палеміку і пакінем такую цудоўную версію на сумленні знакамітага нашага земляка. А вось з тым, што прозвішча Урсын чымсьці сугучнае старажытна-рымскаму, пагадзіцца можна.

Паводле звестак, якія прыводзіць Юльян Урсын Нямцэвіч, ягоны род належаў да старэйшых літоўскіх родаў, нягледзячы на тое, што самі маглі паходзіць з тэрыторыі Нямеччыны, адкуль і з'явілася другое прозвішча Нямцэвіч. Дакладна невядома, калі Урсын Нямцэвічы сталі жыць на землях Вялікага княства Літоўскага, але ўжо ў XVI стагоддзі на старажытных беларускіх землях гэта быў заможны род, які валодаў значнай маёмасцю. З тых часоў у памесных уліковых кніжках засталіся запісы, якія пацвярджалі прысутнасць роду Урсын Нямцэвічаў на Віленскіх, Навагародскіх і Берасцейскіх землях. Такія звесткі Юльян мог запазычыць у свайго бацькі Марцэлія, мельніцкага падчашага[2], які сур'ёзна займаўся гісторыяй свайго краю і роду і быў у той час вельмі добра адукаваным шляхціцам. Ён вёў пошукі цікавых звестак у старых архівах і нават напісаў гісторыю свайго Берасцейскага ваяводства, якая магла заставацца ў сямейным архіве ў Скоках да 1915 года. Юльян адзначае, што менавіта бацька абудзіў у яго яшчэ ў дзяцінстве цікавасць да гісторыі. Відавочна, што Марцэлі, які нарадзіўся ў 1721 годзе, мог валодаць цікавымі звесткамі пра свой род, і гэта перадаў Юльяну, свайму старэйшаму сыну, імя якога цяпер не здаецца выпадковым.

Такім чынам, адносна двайнога паходжання прозвішча Урсын Нямцэвічаў нешта высветлілася, але застаецца праблема, як яго пісаць. У сучасным беларускім правапісе па-свойму аргументуецца напісанне такіх складаных прозвішчаў. Не маючы прэтэнзіі да сучаснага правапісу, паслухаем тлума-

чэнне на гэты конт апошняга нашчадка роду, доктара медыцыны Вітальда Урсын Нямцэвіча, які вырас каля Індуры, што пад Гародняй, і жыве цяпер у Польшчы:

«Прозвішча «Урсын Нямцэвіч» пішацца правільна без злучка паміж словамі. «Урсын» нескланяльная частка прозвішча, затое «Нямцэвіч» мае розныя канчаткі ў залежнасці ад скланення».

Нічога выключнага не здарыцца, калі і мы будзем прытрымлівацца ў Беларусі меркавання апошняга нашчадка старажытнага роду, які, на жаль, згасае.

[1] *Легендарны князь літоўска-беларускіх летапісаў, паданне пра якога стала асновай шляхецкай ідэалогіі ВКЛ. Паводле асноўнай версіі, Палемон быў сваяком рымскага імператара Нерона, але з-за жорсткасці імператара ўзначаліў у I стагоддзі ўцёкі 500 сем'яў знатных рымлян.*

[2] *Падчашы — пасада ў ВКЛ у XV—XVI стст., часам тытулаваўся чашнікам. Павінен быў падаваць вялікаму князю літоўскаму напоі, папярэдне пакаштаваўшы іх. Потым пасада стала ганаровым тытулам, які атрымлівалі павятовыя падчашыя.*

# Герб «Равіч»

Урсын Нямцэвічы карысталіся прыватнаўласніцкім гербам «Равіч». На залатым полі шчыта — справа налева — крочыць чорны мядзведзь, на якім сядзіць дзяўчына ў чырвонай сукенцы, з распушчанымі валасамі, у залатой кароне і з распасцёртымі рукамі, трохі прыпаднятымі ўверх. У клейнодзе над шлемам у залатой кароне паміж аленевымі рагамі — палова чорнага мядзведзя з чырвонай ружай у лапе (ён глядзіць таксама налева). Вядомы ў Польшчы з XIV стагоддзя, у ВКЛ — пасля Гарадзенскай уніі 1413 года. У 1455 годзе ім карыстаўся Мікалай, епіскап Камянецкі. Увогуле гербам карысталіся больш за 250 родаў.

Заўважым, што ў VIII томе «Гербоўніка» Каспара Нясецкага за 1841 год апісанне герба «Равіч» прыводзіцца з Папроцкага: «Павінна быць дзяўчына расчэсанай, з каронаю на галаве, абедзве рукі да верху распасцёртыя і трохі павінны быць прыпаднятымі, у сукенцы, толькі рукі па плечы голыя, яна сядзіць на чорным мядзведзі, які бяжыць (улева на шчыце), правая пярэдняя лапа ў яго як да бегу занесеная, у жоўтым полі; у шлеме над каронаю паміж двума аленевымі рагамі — больш за палову мядзведзя, павернутага ўлева, ён як быццам сядзіць, лапу пярэднюю адну апусціў, у правай трымае ружу».

Звернемся да выяў герба «Равіч» у розных выданнях: пачнём з Барташа Папроцкага — на старонцы 428 «Гербаў рыцарства польскага» выдання 1584


428 O KLEYNOCIE

O Kleynocie Ráwicz, ktory przyniesion z Czech do Polski, o czym świadczą wszytkie historye, zá pánowánia Bolesláwá Chábrego. O przodkách tey Fámiliey pisze Dlugosz, że bywáli Audaces & crudeles, nonnulli etiam cõtemptores religionis. Ma być Pánná rozczosána w Koronie, Ręce rozszerzone máiąc, ná Niedźwiedziu Czarnym siedzi w polu zoltym. Ktorego herbu własność obaczywszy, czytáć będziesz o Przodkách y o Potomstwie ich, ktore ią w ták szerokiem Krolestwie wiedźieć mogą.

Rocháná Książe w Czechách, ktory tu potym do Polski z Potomstwem przyszedł, zá pánowánia Bolesláwá Chábrego, w Roku 1003. Wspomina Kromer w Księgách Trzecich, dla tego, że záwsze był życzliwym ze wszytką Fámilią swą Polakom, co záczyna tymi słowy.

Ibi Rex læsam iterum patientiam suam indignatus, & grauibus suorum iniurijs & querelis irritatus, tumultaria manu Bohemum persequitur: quem cum intra fines Regni sui non esset assecutus, auctis copijs Bohemiam longe lateq; populatus est, Oppida & Arces, partem vi expugnauit, partim in deditionem accepit, Pragam, Metropolim, & Wyssegradum Arcem, quo se Dux Boleslaus cum Iaromiro filio receperat, biennio obsessum famæ ad deditionem compulit, fautoribus & adiutoribus ad omnia vsus Cochano & cæteris Rauitis siue Vrsouitis, principe tunc inter Bohemos Familia, cuius Stemma Gentilium est Puella Vrso insidens. &c.

§ Tenże historyk w Księgách Piątych potwierdza tey życzliwości Fámiliey herbu tego przeciwko narodowi Polskiemu, y wiele ich znowu do Polski przyszło, w roku 1106. Chcesz li szerzey wiedźieć, czytay pomienionego historyká Księgi námienione.

Tá Fámilia naprzod osády y opátrzenia brálá w Ráwskiem Woiewodztwie, y wiele tám Miast y Wsi osádźili, ná ktorych w tym wieku wiele Potomstwá. Byli czterzey bráciá, od káżdego z nich zosobná o potomstwie czytáć będziesz, tych imioná były te, Prándotá, Goworek, Groch, Wars.

Prándotá, ktorego sie Potomstwo w tym wieku ná onych osádách Przodkow swych szeroko rozrodźiło. Naprzod Trzlińscy, tám wiele Mężow zásłużonych w tym Domu było Woiewodámi, Kásztellany, Hetmány, v Książąt Mázowieckich, á záwsze Prándotámi sie chrzćili áż po ten wiek. Tychże Dźielnice w Rusi około Sokalá byli Zygmunt y Wáwrzyniec, y tám Potomstwo zostáwili.

§ Z tymiż iedney Dźielnice byli Nowomieyscy z Nowego Miástá w Ráwskiem Woiewodztwie, wiecey á możni ludźie, obrońcy Rzeczypospolitey dobrzy bywáli.

Dom Lenkow, kthorzy są właśni Rokiczcy w Ráwskiem Woiewodztwie. Wspomináią dawne scripta Janá Pákoszá z Rokitnice Stárosto Ráwskiem, ktory z Jedlenská zostáwił to Potomstwo.

Jána, ktorego Mámká názwáłá Lenkiem, y tákże gdy podrosł

Старажытная выява герба «Равіч». Барташ Папроцкі, 1584 г.

года і мядзведзь, які вязе дзяўчыну, і мядзведзь з ружай павернуты направа; праз больш як два з паловай стагоддзі ў «Гербоўніку» Каспара Нясецкага за 1841 год у восьмым томе на 97 старонцы мядзведзь з дзяўчынай рухаецца зусім у процілеглы бок — налева, у той час, як мядзведзь з ружай працягвае глядзець направа; у выданні сучасным — «Энцыклапедыі ВКЛ» за 2006 год у другім томе на старонцы 481 працэс развароту мядзведзяў на гербе «Равіч» завяршыўся — цяпер абодва мядзведзі павернуты налева. Гэты геральдычны рэбус пакінем для навукоўцаў, таму што звычайную блытаніну з малюнкамі гэта не нагадвае. А, можа, нейкі геральдычны сэнс за пяць вякоў павярнуўся з усходу на захад?!

Далей у К. Нясецкага знаходзім цікавую легенду пра гэты герб, пачатак якога закладваўся ў Англіі, калі нейкі англійскі кароль пасля смерці пакінуў пасля сябе аднаго сына і дачку, якую ў пасаг надзяліў усялякай рухомасцю і часткай каралеўскага скарбу. Яе брат, які, вядома, заставаўся на каралеўстве пасля бацькавай смерці, ведаў, што ён змог бы атрымаць тыя вялікія скарбы, калі б яго сястра была выдана замуж за мяжу, таму што каралеўскія скарбы за мяжу перамясціць было нельга. Колькі ж багатых і годных жаніхоў за яе змагаліся паводле парады сваіх блізкіх! Тады брат, спалохаўшыся магутнасці замежнага жаніха, вырашыў аддаць яе ў ахвяру драпежнаму мядзведзю. Па


HERBY
RYCERZTWA
POLSKIEGO.
Nápiecioro Xiąg
rozdzielone.
Przez Bartosza Paprockiego
zebráne y wydáne: Roku Pańskiego,
1584.
Nemo gloriatur, quod magnæ Vrbis ciuis
sit: sed quòd dignus magna & illustri pa-
tria Arist.
W Krakowie/
W Drukarni Macieia Garwolczyka.
Roku Pańskiego 1584.

«Гербы рыцарства польскаго». Барташ Папроцкі, 1584 г.

волі Божай той мядзведзь не толькі не прычыніў дзяўчыне ніякай шкоды, але песціцца пачаў да яе і ступні яе так доўга лізаў, што прынцэса яго сваім поясам захамутала і на ім жа пакінула дзікую тэрасу, пра што паведаміла пазней свайму жорсткаму брату. Той угаварыў яе і аддаў замуж за латарынгскага князя, ад якога яна нарадзіла некалькі сыноў. Прынцэса паклапацілася пра свой герб з выявай, дзе яна едзе трыумфальна на чорным мядзведзі, які ёй падараваў жыццё. Яна пражыла шчаслівае жыццё, а гэты герб з нашчадкамі яе сыноў разышоўся па іншых краінах. Праз некаторых з іх трапіў у Чэхію, адтуль у Польшчу, потым у Літву. Шмат іншых родаў у Еўропе карысталіся і, мабыць, цяпер карыстаюцца гэтым запамінальным гербам «Равіч».



Сучасны выгляд герба «Равіч».

# Прачытаўшы кнігу

*На кнігавыдавецкай ніве сёння з'яўляецца нямала займальных краязнаўчых кніг. Ранейшыя традыцыі, усталяваныя, замацаваныя, развітыя Адамам Мальдзісам, Генадзем Кісялёвым, Генадзем Каханоўскім, Уладзімірам Содалем, Львом Чамярыцкім, Віталем Скалабанам, Міхасём Чарняўскім, іншымі пісьменнікамі, гісторыкамі, архівістамі, працягваюцца і набываюць болей шырокую прастору. У рэгіёнах выходзяць перыядычныя выданні. У абласных і нават раённых гарадах выдаюцца адмысловыя, цікавыя кнігі. Можна смела агучваць перакананне, што цэнтрамі краязнаўчай работы сталі Віцебск, Магілёў, Гомель, Гродна, Брэст, Пінск, Полацк, Орша... Прыкметна часцей сталі друкавацца ў рэспубліканскай перыёдыцы з краязнаўчымі артыкуламі не толькі настаўнікі сельскіх школ, але і бібліятэкары. Што цікава, з шараговых інфармацыйных артыкулаў іх выступленні пераходзяць у ранг даследаванняў, якія зроблены на гады. Не магу не назваць аўтараў з месц, чые публікацыі не могуць не прыцягваць увагу: Таццяна Канапацкая з Лунінца, Юрась Клеванец з Асіповіч, Андрэй Блінец з Клецка, Міхась Казлоўскі з Маладзечна, Клаўдзія Рогава з Узды, Ілья Януш з Лепеля... Здавалася б, на першы погляд, іх непрыкметная літаратурна-краязнаўчая работа прывязана толькі да пэўнага рэгіёна, да пэўнай мясцовасці... Але ж гэта не так. На прыкладзе рэгіянальнага матэрыялу аўтары нарысаў, эсэ, карэспандэнцый, артыкулаў раскрываюць пытанні дастаткова важкія і актуальныя ўвогуле для выхавання ў грамадстве патрыятычнай свядомасці, грамадскай, нацыянальнай культуры, звяртаюць увагу на прыярытэты дзяржаўнага будаўніцтва. Руплівасць краязнаўцаў становіцца сур'ёзным складнікам і сістэмы ідэалагічнай работы. Важна толькі як след разгледзець грамадскую ініцыятыву, паставіць яе на службу інстытутаў улады, інстытутаў выхавання грамадзяніна і патрыёта сваёй Айчыны.*

*...Так склалася, што ў апошнія год-паўтара наша выдавецтва працавала з рукапісамі аўтараў, якія жывуць і працуюць у Брэсце, на Берасцейшчыне. Мы выдалі кнігу вершаў «Вяртанне» ўраджэнца Пінска, вядомага ў Еўропе публіцыста і празаіка Рышарда Капусцінскага ў перакладзе на беларускую і рускую мовы, зборнік аповесцей Міколы Купрэева «Палеская элегія», зборнік вершаў Міхася Рудкоўскага, Міколы Пракаповіча, Алеся Каско «Трохперсце», літаратурна-краязнаўчую манаграфію В. Ляшук, Т. Снітко «Літаратурная Берасцейшчына», альбом-кнігу Вольгі Лабачэўскай «Сялянская энцыклапедыя ў творах Мікалая Тарасюка», паэтычны зборнік таленавітай маладой паэткі Ярыны Дашынай... Праца над гэтымі кнігамі была суцэльнай асалодай. І ў прозе, і ў паэзіі, у краязнаўчых тэкстах кожнага з рукапісаў энергетычным рухавіком выступала велізарнае жаданне аўтараў перш-наперш у вырашэнні любой тэмы паставіць любоў да Радзімы, любоў да Айчыны... Гэтая катэгорыя набывае эстэтычныя параметры, выступае мастацкай характарыстыкай. Ці магчыма такое, скажуць літаратуразнаўцы? Магчыма! Прачытайце згаданыя кнігі. Спакойна, удумліва, з разлікам на суперажыванне — і вы адчуеце, выразна разгледзіце тую звышзадачу, якую вырашаюць пісьменнікі Берасцейшчыны, найболей цікавага і адметнага гістарычнага куточка нашай краіны. Магчыма, яшчэ і таму, што на Берасцейшчыне існуе адмысловая атмасфера падтрымкі культуры і асветніцтва. І ў сістэме кіравання ўладай, і ў грамадскім асяродку разумеюць, што жыць і працаваць яшчэ трэба і з разлікам на будучыню.*

*У агульным радзе значных здабыткаў апошняга часу ў літаратурнай, краязнаўчай біяграфіі рэгіёна — і кніга «Нямцэвічы». ...Перагорнуты яе апошнія*

*старонкі, старонкі асабіста мнё нечаканай кнігі. Кандыдат фізіка-матэматычных навук з Брэста, загадчык кафедры фізікі Брэсцкага тэхнічнага універсітэта Анатоль Гладышчук проста і нязмушана выказаўся па многіх пытаннях далёкай і нядаўняй гісторыі. Выказаўся, разглядаючы лёс прадстаўнікоў шляхецкага роду Нямцэвічаў, Урсын-Нямцэвічаў, герба «Равіч». Здавалася б, сямейныя гісторыі — не зусім тыя абсягі, што дапамогуць узнавіць шырокую палітычную, грамадскую, сацыяльную прастору. Ды гэта толькі на першы погляд... На самай справе сацыяльна актыўная, дзеяздольная, шчыра заклапочаная ў змене навакольнага жыцця да лепшага, такая сям'я не можа не ўвабраць у сябе падзеі эпохі. Тым болей — у разрэзе розных гістарычных часін.*

*«Энцыклапедыя гісторыі Беларусі», безліч гістарычнай і краязнаўчай літаратуры апошніх дзесяцігоддзяў і раней асвятлялі постаць пісьменніка, палітычнага дзеяча, гісторыка Юльяна Нямцэвіча, які нарадзіўся ў Скоках на Берасцейшчыне ў 1758 годзе. Як звычайна і бывае ў судакрананні з асобай, чый жыццёвы шлях за смугою даўніны відаць не вельмі выразна, аўтары выкладалі звесткі агульнага характару. І нават у тых выпадках, калі не шкадавалі эпітэтаў у дачыненні да слыннага суайчынніка. Лёс, біяграфія Нямцэвіча, яго папярэднікаў і наступнікаў, якраз дазвалялі гэта рабіць. Трэба сказаць пра палітыка? Калі ласка: пасол на Чатырохгадовым сойме 1788—1792. Удзельнік распрацоўкі Канстытуцыі 3 мая 1791 года. Пасля — у эміграцыі. У час паўстання 1794 г. — ад'ютант і сакратар Тадэвуша Касцюшкі. Паранены і зняволены ў Петрапаўлаўскую крэпасць. Пасля разам з Касцюшкам — у эміграцыі. У 1807 годзе вярнуўся ў імперыю. Займаў пасаду сакратара Сената Каралеўства Польскага... Пісьменнік? Так, «адзін з выдатнейшых пісьменнікаў польскага Асветніцтва». Аўтар раманаў, аповесцей, драматычных і паэтычных твораў. Занатаваў выключна цікавыя па фактаграфіі «Гістарычныя падарожжы па польскіх землях», што адбыліся ад 1811 да 1828 гг. Напісаў «Гісторыю панавання Жыгімонта III» у трох тамах...*

*А іншыя Нямцэвічы... Францішак (1718—1795) — чашнік брэсцкі ў 1750 годзе. Пасол на соймы 1750, 1764, 1773—1775... Станіслаў (1753—1817) — дэпутат Трыбунала ВКЛ у 1781—1782, губернатар гродзенскі з 1816... Кароль (1797—1867) — віцэ-маршалак Гродзенскай губерні. Удзельнік паўстання 1831 года... Менавіта ён спрычыніўся да выдання ў Парыжы ў 1848 годзе «Успамінаў часоў маіх» Юльяна Нямцэвіча...*

*Так, гісторыкі і энцыклапедысты час не марнавалі і многія памяткі з архіваў ды адкрытых друкаваных крыніц на свет Божы для ўсеагульнага спажыву выцягнулі. І тым самым ужо прывабілі ўвагу да Нямцэвічаў. Анатоль Гладышчук пайшоў далей шляхам настойлівага і напружанага, не заўсёды разлічанага на ўдачу, пошуку. Краязнаўца, а як паказвае абагульненне і апісанне знойдзенага, і дасведчаны, удумлівы гісторык зрабіў тое, што прыцягвае да роду Нямцэвічаў і шараговага чытача. Аўтар кнігі, паказаўшы месца сваіх герояў у гісторыі Беларусі, Польшчы, Расіі, у гісторыі Еўропы і Амерыкі, яркім праменнем высвеціў дзіўную сілу паяднання Нямцэвічаў з Айчынай, са Скокамі, што на Берасцейшчыне. Так, Скокі — гэта цэлы Сусвет, гэта крынічная прастора, што дазваляе быць моцнымі, скіраваць гэтую моц на службу Айчыне, спраектаваць дзякуючы сіле родных ваколіц лёс дзяржавы і сям'і на многія і многія гады наперад.*

*У беларускім краязнаўстве, якое, несумненна, мае шмат добрых традыцый, дазваляе служыць вартым увагі выхаваўчым матэрыялам для моладзі, усё ж не хапае расповедаў радаводнага характару, расповедаў, дзе знітаваны былі б гісторыі сям'і і гісторыі Айчыны. Кніга «Нямцэвічы» Анатоля Гладышчука — уражлівы прыклад такога даследавання. Як тут не згадаць даўно сказанае Мікалаем Бястужавым: «Людзі знікаюць... але прыцягненне да іх застаецца вечным, і тым мацней, чым больш аддаляецца ад нас дзейная асоба. Ці не даказвае гэта сваяцкай сувязі чалавечага роду, якая перадаецца з пакалення ў пакаленне?..»*

*Алесь КАРЛЮКЕВІЧ*

# Змест


Да чытача .......... 5
Прадмова .......... 7
Урсын Нямцэвічы .......... 8
Герб «Равіч» .......... 10





Дзіцячыя летуценні Юльяна. Гісторыя першая .......... 13
- Уступнае слова .......... 14
- Дзяцінства ў Скоках .......... 15
- Дзед Аляксандр з Клейнікаў .......... 18
- Ксёндз-прэлат з Вістыч .......... 19
- Набожнасць тых часоў .......... 21
- Кухар Ян .......... 23
- Сусед Флемінг .......... 24
- Гістарычная даведка .......... 25





Цагляная калона на Рахвале. Гісторыя другая .......... 27





Век хлапчукоўскі. Гісторыя трэцяя .......... 33
- Апошні з Пястаў на каралеўстве .......... 34
- Смерць дзеда ў Клейніках .......... 36
- Спасціганне навук розных .......... 40
- Часы Барскай канфедэрацыі .......... 44
- Карціна звычаяў мясцовых .......... 49
- Падарожжа да рыцараў .......... 53
- Кароль з Воўчына (гістарычная даведка) .......... 56





Школа рыцараў. Гісторыя чацвёртая .......... 63
- Школьныя асновы .......... 64
- Кароль і Кузьма .......... 68
- Першы падзел .......... 72

Варшава ў забавах ... 80
Камісія Адукацыйная ... 84
Дома ў Скоках ... 90
Выхад у свет ... 94



Капліца Марыі Егіпецкай. Гісторыя пятая ... 99



Ад'ютант князя. Гісторыя шостая ... 107
Служба ... 108
Сойм percepty i ekspensy ... 112
Караван княжацкі ... 116
Вяселле ў Белай ... 124
Трыбунал Літоўскі ... 131
Антоній Тызенгаўз ... 139
Табакерка імператара ... 142



Раман у Нэплях. Гісторыя сёмая ... 151



Ян Тытус і яго час. Гісторыя восьмая ... 163



Прынц Баварскі. Гісторыя дзевятая ... 171




Скокаўскае рэха. Гісторыя дзесятая ... 189
«Драбніцы мінуўшчыны» ... 190
«Маім унукам» ... 197





Крыпта Нямцэвічаў. Гісторыя адзінаццатая ... 205





Апошні з’езд Нямцэвічаў. Гісторыя дванаццатая ... 215
Экскурсія на Палессе ... 216
Вітальд ... 226
Барбара ... 231
Юзэф ... 235
Тэрэса ... 236





Радавод Урсын Нямцэвічаў ... 239
Родазаснавальнікі ... 240
У Вялікамірскім павеце ... 241
Лявошкі каля Картуз-Бярозы ... 243
Нэплі на Заходнім Бугу ... 244
Аляксандр з Клейнікаў ... 248
Скокі Марцэлія ... 251
Юльян ... 253
Радня Юльяна ... 257
Ян Тытус ... 262
Палац у Скоках ... 264
Гродзенскае разгалінаванне ... 271
Апошнія ... 274
Калужскі след ... 276

Прачытаўшы кнігу (Алесь Карлюкевіч) ... 282

**Гладышчук, А. А.**

Г52 Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі : гісторыка-дакументальны нарыс / А. А. Гладышчук. — Мінск : Литература и Искусство, 2009. — 288 с. : іл.

ISBN 978-985-6720-55-3

Кніга «Нямцэвічы. Сапраўдныя гісторыі» складаецца з дванаццаці раздзелаў, разнастайных па змесце, якія здолелі аб'яднаць 250 гадоў беларускай гісторыі. Аповеды пра Урсын Нямцэвічаў, жыццёвыя калізіі прадстаўнікоў гэтага слыннага роду з'яўляюцца адлюстраваннем цэлай эпохі, што дазваляе глыбей пазнаёміцца са сваёй гістарычнай спадчынай, якая выклікае не проста звычайную чытацкую цікавасць, але і становіцца сапраўднай культурнай каштоўнасцю. Змешчаны напрыканцы выдання «Радавод Урсын Нямцэвічаў» стаўся вынікам шматгадовых даследаванняў, і, несумненна, будзе цікавы і пазнавальны шырокаму колу аматараў гістарычнай і краязнаўчай літаратуры.

**УДК 94(476)**
**ББК 63.3(4Беи)**

Навукова-папулярнае выданне

**ГЛАДЫШЧУК** Анатоль Антонавіч

**НЯМЦЭВІЧЫ. САПРАЎДНЫЯ ГІСТОРЫІ**

Гісторыка-дакументальны нарыс

Рэдактар *В. Ц. Вольскі*
Мастак *У. І. Шолк*
Камп'ютэрная вёрстка *У. І. Шолк, В. І. Канстанцінава*
Карэктар М. С. Гілевіч

Падпісана ў друк 9.01.2009. Фармат 70х108/16. Папера афсетная.
Гарнітура NewtonWINCTT. Афсетны друк.
Ум. друк. арк. 25,2. Ул.-выд. арк. 25,26. Тыраж 2000 экз. Зак. 1023 .

ISBN 978-985-6720-55-3

Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Литература и Искусство».
ЛИ 02330/0056810 ад 02.03.2004.
Вул. Захарава, 19, 220034, г. Мінск.

Вытворчае рэспубліканскае унітарнае прадпрыемства
«Мінская фабрыка каляровага друку».
ЛП 02330/0056853 ад 30.04.2004.
Вул. Каржанеўскага, 20, 220024, г. Мінск.